

ДОМ ЗА БАЗАВУЮ 3



ГОГАЛЬ МОЦНА Б ЗДЗІВІЎСЯ... 16

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 ліпеня 2024 г.
СЕРАДА
№ 142 (30276)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Святлана ЛЮБЕЦКАЯ, суддзя Канстытуцыйнага Суда:**

*«Што датычыцца далейшага развіцця інстытута Прэзідэнта, вельмі цікавы этап мы перажываем. Тыя палажэнні, якія былі замацаваны, і бачанне Прэзідэнтам далейшага развіцця іншых галін улады — усё гэта звязана з пераразмеркаваннем паўнамоцтваў. Гэта новы этап развіцця як для самога інстытута прэзідэнцтва, так і для іншых галін улады, на якія ўскладаецца частка паўнамоцтваў і частка адказнасці».*

# На траіх адно неба



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**Аляксандр і Ганна ЛІПАЎСКІЯ даўно звязалі свой лёс з авіяцыяй. Муж працуе намеснікам камандзіра лётнага атрада авіякампаніі «Белавія», жонка ў гэтай жа кампаніі адказвае за работу з моладдзю. Хутчэй лагічна, чым дзіўна, што і сын Максім вырашыў працягнуць палётную дынастыю: ён скончыў першы курс Беларускай дзяржаўнай акадэміі авіяцыі, дзе вучыцца на лётчыка.**

## КОРАТКА

• **Беларуская дэлегацыя на чале з першым намеснікам міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Аляксандрам Корбутам прымае ўдзел у 46-й сесіі Камітэта сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, якая праходзіць гэтымі днямі ў Дэлі.**

• У Беларусі намалочана збожжа з улікам рапсу 3,492 млн тон, з іх — 2,563 млн тон збожжавых і зернебабовых культур, 929 тыс. тон азімага рапсу.

• **БелАЗ падпісаў з расійскімі партнёрамі пагадненне, якое прадугледжвае пастаўку трох 130-тонных самазвалаў-гібрыдаў, якія выкарыстоўваюць у якасці паліва вадарод, для пачатку іх доследнай эксплуатацыі на Сахаліне.**

• Акадэмічны драматычны тэатр імя Максіма Горкага ўпершыню адправіцца на гастролі ў Сочы.

ISSN 1990 — 763X
24142
9 771990 763008




# І Ў АГОНЬ, І Ў ВАДУ, І НА ЛЮБЫЯ ВЫШЫНІ

### Як гэта — быць сучасным ратавальнікам?



**Журналістам нярэдка даводзіцца пісаць пра надзвычайныя сітуацыі. Але прадстаўнікі СМІ не заўсёды ўяўляюць спецыфіку работы супрацоўнікаў МНС у поўным аб'ёме. Таму выратавальнае ведамства арганізавала для журналістаў спецыяльнае навучальнае мерапрыемства. Так, днямі ва Універсітэце грамадзянскай абароны МНС адбыўся семінар «Адзін дзень з МНС». Карэспандэнт «Звязды» паглыбіўся ў прафесію ратавальніка, прымерыў ахоўнае адзенне і паспрабаваў сябе ў бе рацьбе са стыхіяй.**

СТАР. 4

Соцыум

# Першае месца

### Як зрабіць так, каб адаптацыя маладога спецыяліста была ўдалай



**Паспяховая адаптацыя маладога спецыяліста на першым працоўным месцы — пытанне дзяржаўнай важнасці. Работнік яшчэ не пачаў выконваць свае абавязкі, а ў яго ўжо ўкладзены час і фінансавыя сродкі. У тым, каб гэтая адаптацыя адбывалася як мага хутчэй і «без болю», зацікаўлены і работадавец, і сам малады спецыяліст, для якога гэта сур'ёзны жыццёвы этап. Бо першае працоўнае месца, як і ўсё першае (ад першага кахання да першай сесіі) ніколі не забудзецца. І ад таго, якія пачуцці будзе выклікаць гэты ўспамін, шмат у чым залежыць шлях чалавека ў прафесіі.**

СТАР. 5